Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе кампазітар Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

КРЫНІЧНАЯ ВАДА

Алесь Пісьмянкоў (1957—2004) — вядомы беларускі паэт, эсэіст, член Саюза пісьменнікаў БССР з 1984 г. Скончыў філфак БДУ. У розныя гады працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя» і «Вожык». Аўтар кніг паэзіі «Белы камень», «Чытаю зоры», «Планіда», «Журавель над студняй», «Я не памру, пакуль люблю», «Думаць вершы». У 2012 годзе у Выдавецкім доме «Звязда» выйшаў зборнік «Не знікай», яго ўкладальнікам стала жонка пісьменніка Алена Пісьмянкова.

Вершы — Алесь ПІСЬМЯНКОЎ.
Музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.

1. Спавядацца бяжым да прыроды,
Ачышчацца бяжым ад маны.
Мы апошнія з нашага роду,
Каму сняцца вясковыя сны.

Прыпеў:
Вада, крынічная вада.
Відаць, пілі такую продкі.
Вось гэтак прагна і салодка —
Аж забывалася бяда.

2. Каго мучыць няўтольная смага
Па водару сонечных хат!
Мы з табой пералётныя птахі,
Якім не вярнуцца назад.

Прыпеў.

3. Нам паліць з успамінаў цяпельца,
Нам да скону ўспамінамі жыць:
Тым азерцам, што плешчацца ў сэрцы,
Той рачулкай, што з сэрца бяжыць...

Прыпеў.



Спажывец

ЗАМЕСТ АРЫГІНАЛА — ПАДРОБКА

Мужчына набыў бензапілу ў невядомага прадаўца непадалёк ад гандлёвага аб'екта. Думаў, што набывае электраінструмент папулярнага брэнда. Аб гэтым сведчыла і цана бензапілы — 600 рублёў. Але замест арыгінала мужчыне прадалі падробку.

На тавары значылася марка нямецкага брэнда STIHL. Пры гэтым рэч была без упакоўкі і якіх-небудзь таварасуправаджальных дакументаў. Тавар пакупніка задаволіў. Аднак праз некаторы час у яго ўзніклі сумненні наконт таго, ці з'яўляецца тавар арыгіналам.

Паколькі звязацца з прадаўцом не ўдалося, мужчына звярнуўся ў Смаргонскі РАУС. Каб устанавіць кошт тавару, была прызначана судовая таваразнаўчая экспертыза. Вынікі паказалі, што бензапіла не адносіцца да арыгінальных вырабаў адпаведнай маркі. Акрамя таго, адрозненне датычылася спосабу і месца нанясення маркіроўкі. Напрыклад, замест ціснення і палімерных уставак былі наклейкі, таксама адсутнічаў серыйны нумар пілы.

Згодна з вынікамі судовай экспертызы, рэальны кошт тавару ў два разы ніжэйшы за той, які заплаціў жыхар Смаргоні. Міліцыя праводзіць па дадзеным факце праверку.

Ва ўпраўленні ДКСЭ Гродзенскай вобласці раяць адмовіцца ад сумніўных пакупак у незнаёмых людзей, асабліва калі гаворка ідзе аб каштоўных рэчах. Іншым разам звычайнаму чалавеку складана адрозніць якасную падробку ад арыгінала. Калі ж хтосьці вырашыў сэканоміць і набыць тавар праз інтэрнэт, перад пакупкай варта азнаёміцца з характарыстыкай і прыкметамі арыгінальнага тавару і параўнаць іх з тымі, якія прапануе прадавец.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

30 ЛІПЕНЯ

У краіне

1871 год — нарадзіўся Віктар Іванавіч Чавусаў, беларускі журналіст і грамадскі дзеяч, адзін з кіраўнікоў Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў і Мінскага літаратурна-артыстычнага таварыства.

1906 год — нарадзіўся (цяперашні Чашніцкі раён) Іван Міхайлавіч Краснік, Герой Савецкага Саюза. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на Заходнім, Калінінскім, Ленінградскім і 1-м Беларускім франтах. У 1945-м вызначыўся ў баях на тэрыторыі Германіі.

1941 год — нарадзілася Ніна Іванаўна Круціліна, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі і прамянёвай тэрапіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па прамянёвай тэрапіі анкалагічных хворых, спосабах прафілактыкі і карэкцыі парушэнняў гемапаэзу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1951 год — нарадзіўся Генадзь Прохаравіч Шышоў, беларускі спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ), заслужаны трэнер Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі.

1966 год — у Беларусі адноўлены 17 раней скасаваных раёнаў.

1991 год — нарадзілася Ірына Валер'еўна Крыўко, беларуская спартсменка (біятлон), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіёнка XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў (2018, Пхёнчхан), кавалер ордэна «За асабістую мужнасць».

У свеце

1511 год — нарадзіўся Джорджа Вазары, італьянскі жывапісец, архітэктар і пісьменнік. Аўтар знакамітых «Жыццяпісаў», заснавальнік сучаснага мастацтвазнаўства.

1676 год — нарадзіўся Барыс Іванавіч Куракін, гісторык, дыпламат, расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч, генерал-маёр. Адзін з найбліжэйшых паплечнікаў Пятра I. Пакінуў багатую рукапісную спадчыну, значную для генеалогіі Беларусі.

1886 год — нарадзіўся Георгій Сямёнавіч Вярэйскі, расійскі мастак, графік, народны мастак РСФСР, правадзейны член АМ СССР. Лаўрэат Сталінскай прэміі.

1961 год — газета «Правда» апублікавала праект трэцяй Праграмы КПСС, у якой былі агучаны канкрэтныя тэрміны пабудовы камунізму. Апошняя фраза гэтага дакумента — «Цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме!»

Так гаварыў...

Леў ТАЛСТОЙ:

«Чалавек перастае асуджаць іншых, як толькі пераможа самога сябе».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.20	21.11	15.51
Віцебск —	5.04	21.06	16.02
Магілёў —	5.10	21.01	15.51
Гомель —	5.14	20.51	15.37
Гродна —	5.37	21.25	15.48
Брэст —	5.44	21.19	15.35

Месяц

Поўня 24 ліпеня
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Маргарыты, Марыны, Лазара, Леаніда.*
К. *Людмілы, Юліты, Леапольда, Пятра, Расціслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1894. Нумар падпісаны ў 19.30 29 ліпеня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12